# Смак жыцця

Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі стартаваў яшчэ адзін прыкметны фотапраект на важную тэму — 2 чэрвеня ў галерэі «Панарама» адкрылася фотавыстаўка «Смак жыцця». Яна прымеркавана да 25-годдзя з дня заснавання РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. І гэта не карпаратыўная справаздача, як можна падумаць, а паўнавартасны мастацкі праект — аб адчужэнні, адзіноце, але ў той жа час і аб падтрымцы, веры ў людзей, «аб прыгажосці чалавека, які праходзіць курс хіміятэрапіі».




Наведвальнікам прапануюцца 13 фотагісторый пацыентаў РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Лізавета Балабан, Яраслаў Ткачоў, Міраслаў Шаўчук, Мілана Абрамовіч, Хабіба Каландарава і іншыя героі распавядаюць аб прыняцці сябе і перамен у сваёй знешнасці, выкліканых хіміятэрапіяй, аб цяжкасцях